# Так для мяне пачалася вайна



*З успамінаў удзельніка вызвалення Хоцімска, падпалкоўніка ў адстаўцы Маісейкіна Аляксея Канстанцінавіча, ураджэнца Хоцімска.*

—У 1941 годзе я скончыў ваеннапалітычнае вучылішча ў г. Хабараўску. А ўжо ў верасні быў прызначаны палітруком 7-ай роты 1324 стралковага палка, 413-ай стралковай дывізіі. Асабовы склад дывізіі ў асноўным быў з сібіракоў. У хуткім часе пагрузіліся ў эшалон і адправіліся на фронт.

Наш полк прыбыў ноччу на станцыю Вузлавая Тульскай вобласці. Фашысцкая авіацыя разбамбіла яе, былі спалены склады са збожжам, цягнік з прадуктамі харчавання, а таксама ваеннымі грузамі. 18 лістапада 1941 года на нашу дывізію нанеслі моцны ўдар гудэрыянаўскія часці на Балахоўскім напрамку. У гэтым парадку размяшчаўся штаб палка. Камандзір палка Д.М. Карнееў, камісар Ф.У. Кузняцоў, старшы лейтэнант В. Наздрухін і малодшы лейтэнант А. Андрэенка сабралі рэштκі асабовага саставу, якія абаранялі школу, усіх параненых, якія маглі ўдзельнічаць ў далейшым руху цяжка параненых. Камісар палка таксама атрымаў раненне ў баі.

Салдатаў у роце засталося зусім мала. Была пастаўлена перад намі задача: прарывацца праз варожае кальцо, нягледзячы на страты! Немцы пускалі ракеты, праз узмацніцель круцілі пласцінкі з запісам рускіх песень. Прапаноўвалі нам здавацца. Праз нейкі час нашы разведчыкі паведалі аб магчымасці выйсці з акружэння. Праціўнік выявіў нас са спазненнем, адкрыў моцны агонь. У маім узводзе былі забіты два і паранены сем байцоў. Задача праравацца была выканана... Чацвёра сутак байцы на невялікім участку Балахова, Дзядзілава сваім супраціўленнем ворагу дазволілі Чырвонай арміі значна ўмацаваць абарону.

Мы прайшлі вышыню, пераадолелі невялікую рэчку і накіраваліся ў напрамку Калодзежнай. Астаткі дывізіі былі перафарміраваны.

У далейшым удзельнічаў у жорсткіх баях у раёне Тулы, Серпухава, Юхнава.

Самым памятным для мяне стаў дзень 24 верасня 1943 года, калі праравáўшы абарону праціўніка ў дзесяць гадзін раніцы, полк дасягнуў мяжы роднай Беларусі — в. Малая Ліпаўка Хоцімскага раёна.

Камандзір дывізіі папрасіў дазволу ў камандуючага 50-ай Арміі Болдзіна начною атакаю выбіць немцаў з Вялікай Ліпаўкі.

Пачалі наступленне. Наш полк наступаў “у лоб’’.

Немцы кантратакавалі з Хоцімска. Полк адбіў чатыры варожых атакі. Не дабіўшыся поспеху, немцы “кінулі” на нас танкі. Нашы саперы з 407 палка пад прыкрыццем туману замініравалі дарогі, якія ішлі з Хоцімска. Некалькі варожых машын падарваліся на мінах, але працягвалі наступленне. Услед за танкамі пайшлі аўтаматчыкі. Чырвонаармейцы адсеклі пяхоту немцаў і самі пайшлі ў атаку. У хуткім часе мы авалодалі вёскаю Альшоў, выбілі ворага з вышыні 167,8 м.

На дарозе каля в. Альшоў мы ўбачылі калону мірных жыхароў, якіх немцы хацелі забраць з сабою для прыкрыцця. Байцы кінуліся ў рашучую атаку, у выніку

якой вораг быў знішчаны, а жыхары вёскі вызвалены. Да вечара 26 верасня 1943 года ў 19.30 Хоцімск — першы раённы цэнтр Магілёўскай вобласці быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У гэты дзень па маскоўскаму радыё Левітан абвясціў, што воінскія часці Бранскага фронту перасеклі граніцу Савецкай Беларусі.

У далейшым наш полк дзейнічаў у складзе 108-ай стралковай дывізіі, дайшоў да г. Данцыга.

За баявыя заслугі перад Радзімай быў узнагароджаны трыма ордэнамі Айчыннай вайны, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Наталля КАЦЯШОВА.**

**Кацяшова, Н.** Так для мяне пачалася вайна : [аб вызваленні Хоцімска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў] / Наталля Кацяшова // Шлях Кастрычніка. — 2010. — 25 верасня. — С. 2.